# ДА ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ Ў ГОМЕЛЬСКІМ ПЕДАГАГІЧНЫМ ІНСТЫТУЦЕ (1929-1939)

**Ж.І. Гуляева**

Пачатак дзейнасці інстытута прыпадае на 30-ыя гады, час, калі востра стаяла пытанне беларусізацыі. Афіцыйны курс на ажыццяўленне беларусізацыі пачаўся ў ліпені 1924 г., калі была намечана шырокая праграма нацыянальна-культурнага адраджэння. Прыкладам таму з'яўляецца і Гомельскі педінстытут. З самага пачатку яго існавання ставілася задача аб пераводзе дзейнасці ВНУ на беларускую мову. Гэтае пытанне паўставала амаль з першых дзен працы педінстытута і неаднаразова гучала ў адпаведнай дакументацыі, дзе гаварылася аб тым, што частка выкладчыкаў і студэнства не ўразумела значэння беларусізацыі і сутнасць нацпалітыкі і карыстаецца «расійскай» мовай.

Для вырашэння гэтага пытання праводзіліся месячнікі беларусізацыі, складваліся камісіі па праверцы беларусізацыі калектыву інстытута. Вось, напрыклад, вывады камісіі, зробленыя 17 студзеня 1932 г. Праз яе было прапушчана 56 чалавек. Пры праверцы звярочвалася ўвага на штодзеннае ўжыванне беларускай мовы. У выніку было адзначана, што значная частка студэнтаў недастаткова ўжывала беларускую мову ў штодзенным жыцці, частка яе зусім не ведала. Увогуле, пэўныя «таварышы» адносіліся да прапаноў камісіі «з прахладцам».

За гады беларусізацыі неабходнасць публічнага ўжывання роднай мовы замацавалася ў свядомасці многіх людзей, у тым ліку і выкладчыкаў інстытута. Прыкладам можа стаць Філіп Ігнатавіч Масайлаў, выкладчык беларускай мовы. У сваей настаўніцкай дзейнасці ен вызначаў паняцці дзяржаўнасці і беларускай мовы, распавядаў аб росквіце дэмакратыі Беларусі у XI і XIII ст.ст.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ужо к 1937 г. большасць прадметаў у інстытуце выкладалася на беларускай мове.

Але ў 30-ыя гады моўная палітыка партыйна-дзяржаўных улад пачынае насіць супярэчлівы характар. З аднаго боку, многа гаварылася аб неабходнасці развіцця нацыянальнай мовы, а з другога – усе рабілася для таго, каб абмяжоўваць ужыванне беларускай мовы. У перадваенныя гады ўсе выкладчыкі інстытута перайшлі на рускую мову. Не утрымаўся ад русіфікацыі і вопытны выкладчык батанікі Яновіч. Доўгі час ен чытаў лекцыі на беларускай мове, але на прыкладзе сваіх калег адказаўся ад яе.

Разам з вывучэннем беларускай мовы гучала пытанне і аб вывучэнні моў нацыянальных меншасцяў, бо з ажыццяўленнем палітыкі беларусізацыі яўрэйскаму і польскаму насельніцтву была дадзена магчымасць карыстацца роднай мовай у школах і дзяржаўных установах. Ужо у 1931 г. ставілася задача аб арганізацыі яўрэйскага і польскага адзяленняў, т.я. вывучэнне польскай і яўрэйскай моў праз групы без стварэння нацыянальных адзяленняў не забяспечвала падрыхтоўкі для нацыянальных школ добраякасных выкладчыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ